# Новости

Образование

27.12.2023

## Конкурс творчых прац студэнтаў першага курса прайшоў у БДУІР

**У БДУІР падвялі вынікі традыцыйнага конкурсу творчых работ на беларускай мове сярод першакурснікаў.**

Мерапрыемства штогод арганізуецца кафедрай агульнаадукацыйных дысцыплін пры дапамозе ППА студэнтаў БДУІР.

З 15 лістапада па 6 снежня ў студэнтаў першага курса, якія вывучаюць дысцыпліну "Беларуская мова. Прафесійная лексіка", была магчымасць прадставіць на конкурс празаічнае эсэ, апавяданне ці паэтычны твор на любую з дзесяці прапанаваных тэм. Журы ацэньвалі работы па наступных крытэрах: арыгінальнасць тэксту, мастацкі падыход, граматнасць, вобразнасць, творчы падыход да праблематыкі.

Па выніках конкурсу былі вызначаны пераможцы:

Дыпломамі за трэцяе месца ўзнагародзілі **Ягора Елінеўскага, Кірыла Каханоўскага, Рыгора Зарэцкага, Аляксея Самсончыка, Кірыла Чаплінскага, Алену Яваровіч, Елізавету Дзмітрыевіч, Данііла Пракаповіча**;

Другое месца занялі **Алексей Мічэйка, Андрэй Шапялевіч, Арцём Штоў, Даніiл Анташэнка, Міхаіл Рапацэвіч, Марына Тарасенка, Марыя Казлоўская, Вікторыя Палякова, Вікторыя Закрэўская**;

Першым месцам былі ацэнены працы **Яна Сякацкага, Яўгеня Нікіценка, Ягора Белана, Яраслава Голуба, Аляксея Струнца, Марыі Саковіч, Марыі Валынец, Яны Румянцавай і Данііла Асіпёнка**.

Удзельнікаў і пераможцаў узнагароджваў дэкан факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі і прафесійнай арыентацыі **Васіль Бандарык**.


BSUIR


БЛАГОДАРНОСТЬ
BSUIR


ДИПЛОМ
BSUIR


BSUIR

Шмат глыбокіх і няпростых тэм узнімалі студэнты ў сваіх працах. Пераможца Марыя Ісаковіч напісала такія важныя словы ў сваім вершы на тэму «Мая радзіма там, дзе мой народ»:

***Мая радзіма там, дзе мой народ,***
***Дзе карані паміж сабой спляліся.***
***Адзін аднаму дапамог,***
***З няласкай сцежкі разышліся.***

***Мая радзіма там, дзе талентаў крыніца.***
***Імкнуцца людзі лепшымі тут стаць.***
***І могуць шчасцем падзяліцца,***
***І ўсё, што маюць, іншаму аддаць.***

***Мая радзіма - гэта крэпасць.***
***І тое месца, дзе ўтульна і цяпло.***
***Пакуль я тут, мне сонейка-краіна***
***Шлях для жыцця пракладвае святлом.***

***Мая радзіма ёсць падмурак,***
***Трывалы мост да шчасця і любві.***
***Не страцце калі ласка дзеля міру,***
***Свету без жаху, болю і вайны.***

***У чым жа прыгажосць майго народа?***
***Адказ упэўнена і хутка вам я дам.***
***Я беларуска, тым я ганаруся.***
***За Беларусь усё да кропелькі аддам.***

***Тут людзі бачаць прыгажосць у простым,***
***У сонцы, зорах, у шуме ручайкоў.***
***Дапамагаюць нават самым злосным***
***Знайсці сябе, свой шлях, свой дом.***

***Добразычлівасць - рыса нашага народа,***
***За плённай працай моц яго стаіць.***
***А міласэрнасці, любві і ласкі карагоду***
***Гатовыя ўвесь свой час мы падарыць***

***І мова родная заўсёды***
***Дапамагае згуртаваць народ.***
***Паказвае, як не блукаць ніколі***

***Паміж чужых і сваякоў.***

***Яна ліецца з вуснаў маці,***
***Яна парное малако.***
***Яна адметнасць нашай нацыі,***
***Вышэйшы сродак сувязі вякоў.***

***Дык дзе ўсё ж такі радзіма?***
***Радзіма там, дзе мой народ.***
***Я частка цэлага, адзінага,***
***І гэта буду паўтараць штогод.***

Падрыхтавана прэс-службай
Фота Андрэя Сіняўскага